

# З клопатам пра моладзь

**Дзве гранд-прэміі і 25 спецыяльных прэмій: Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў рашэнне савета спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.**

Адпаведнае распараджэнне лідар падпісаў 6 студзеня. Прыняцце дакумента накіравана на выяўленне і падтрымку таленавітай моладзі, стварэнне спрыяльных умоў для далейшага развіцця яе здольнасцей.

На гэтыя мэты з рэспубліканскага бюджэту за кошт сродкаў рэзервовага фонду будзе вылучана больш за 100 тысяч беларускіх рублёў.

Уладальніцамі гранд-прэміі з прысваеннем звання лаўрэата спецыяльнага фонду сталі дзве пераможцы міжнародных музычных конкурсаў — Амалія Сухан і Валерыя Бернатовіч, якія прадстаўлялі Беларусь на вакальных конкурсах “Славянскага базару ў Віцебску”.

Спецыяльныя прэміі прысуджаны 25 пераможцам міжнародных і рэспубліканскіх мастацка-творчых спаборніцтваў, у тым ліку — ансамблю кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам Святланы Гуткоўскай, а таксама заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь народнаму харэаграфічнаму ансамблю “Сузор’е”.

Больш звестак — на president.gov.by